Применение в типологическом описании локального типа культуры характологического метода имеет целью отражение внутренней характеристики культуры, вскрывает как образуется смысловая целостность, отдельность культурного типа, который при этом выступает и как обобщение, и как индивидуальность.

Итак, если исходить из положения, что типологические процессы культурного развития проявляются в конкретно-национальных формах, то национальная культура должна охватывать «видовые» проявления культуры, где индивидуальные духовные оттенки возникают из неких системообразующих принципов, в свой черед обусловленных единством исторической среды, т.е. сравнительно устойчивой комбинацией этнических, языковых, экономических, политических, религиозных и прочих предпосылок, преемственностью данных традиций и накоплением данных случайностей, присутствием специфических черт в наследуемой ему социальной деятельности. Национальная культура возникает на основе этнической, преобразует ее образы, элементы; осуществляет выборку сценического, стилизованного фольклора в формах профессионального творчества. По сравнению с этнической культурой в ней есть приращения и новые качества. Внутри культуры как целостности, противостоящей другим целостностям происходит глубокая дифференциация – выкристаллизовываются ее отдельные сферы. Растет уровень национальной художественной культуры, которая в свою очередь включает дифференцированные специфические области: литературу, изобразительное искусство, театр и т.д.

В типологическом описании национальной культуры доминирующим ее признаком выступает локальность (если исходить из положения: одно государство – одна культура), а типоразличительными признаками можно назвать следующие:

- степень выделенности культуры и оформленности ее основных подсистем (т.е. институционально-организационная сфера культуротворчества);
- национальная идея;
- национальное сознание (его мифы и мифологемы);
- специфичность проявления национального характера;
- семиотико-семантические структуры;
- актуализация памяти культуры (отсюда деление на традиционную и креативную культуры);
- переходность эпохи современного бытового состояния;
- социальное время (его содержательное значение) как показатель динамики общественного развития;
- трансфер (по Салееву В.) или пограничный культурный разлом;
- взаимодействие архаики и модерна;
- роль национальной элиты;
- особенности профессионального творчества.

Как видим набор признаков всегда принципиально открытый и их анализ показывает, что чем более богатым, разнообразным, индивидуальным является развитие культуры, тем большее количество переменных должно учитываться при систематизации явлений. Вот почему типология культур однозначно не решена наукой, т.к. культура представляет собой многоуровневое образование, обладающее широкими вариационными возможностями.

УДК 7(476)

***Папко В.М.***

# ГІСТАРЫЧНЫЯ ТЭМЫ І ВОБРАЗЫ Ў СУЧАСНЫМ БЕЛАРУСКІМ МАСТАЦТВЕ

Амаль што не знойдзецца зараз на Беларусі людзей, якія не згадзяцца з думкай, што 90-я гг. ў гісторыі нашай краіны – перыяд вельмі цікавы, своеасаблівы і нават унікальны. Канешне, усё тое новае, што з'явілася ў нашым жыцці не магло абысці сучаснае мастацтва. Адна з такіх агульных для розных відаў мастацтва тэндэнцый – зварот да гістарычнай тэматыкі. Якім чынам гэта адбываецца, што турбуе сучасных беларускіх майстроў мастацтва ? Як трактуюць яны вобразы, зварот да якіх у часы СССР быў значна абмежаваны? Твораў на гістарычную тэму апошнім часам з'явілася нямала і ёсць магчымасць асэнсаваць некаторыя заканамернасці ў гэтым накірунку.

Неабходна прызнаць, што сучасны беларускі тэатр мае зусім іншы твар, чым якіхсці 10-15 гадоў таму. Шмат што ў ім змянілася : новыя акцеры, рэжысёры, больш эксперыментаў у сцэнаграфіі і касцюмах, ужыванне нейкіх зусім не звыклых для вока беларускага гледача прыстасаванняў і машынэрыі. Але ўсё ж галоўная змена – гэта, вядома ж, змена рэпертуару, якая адбылася за апошняе дзесяцігоддзе. Адна з яскравых тэндэнцый сучаснага беларускага мастацтва – творчае пераасэнсаванне падзей даўніны, якія доўгі час былі выкрэслены з памяці народа. Першую скрыпку ў гэтай справе адыгралі гісторыкі і пісьменнікі, якія апантана пераключыліся на вывучэнне гісторыі роднага краю, даследаванне вялікага перыяду, папросту "забытага" у часы СССР. Так паступова падзеі беларускай гісторыі пачынаюць цікавіць і мастакоў, скульптараў, драматургаў і дзеячоў тэатра. Потым прадмет "Гісторыя Беларусі" з'явіўся ў школе.

Калі ўважліва падлічыць, то за гэты час было створана няшмат драматычных твораў, прысвечаных гістарычнай тэматыцы. Але гэтаму ёсць дакладнае тлумачэнне – прафесія драматурга вельмі рэдкая, напісанне п'есы звязана са шматлікімі цяжкасцямі. Але беларускі тэатр прагне новых твораў, шматгранных вобразаў, выбітных асобаў. Цікава было б паглядзець, што ж створана за дзесяцігоддзе незалежнасці Беларусі на сцэне беларускага тэатра. Якія вобразы цікавяць беларускіх драматургаў і рэжысёраў, якой бачаць яны беларускую даўніну, тыя часы, калі вырашўся лёс народа, пераломныя моманты гісторыі?

Асабліва прыцягвае ўвагу творцаў вобраз знакамітай полацкай князёўны Рагнеды, дачкі кн. Рагвалода і жонкі кн. Уладзіміра. Адным з першых звярнуўся да тэмы паганства, хрышчэння Русі і паказаў гэтыя падзеі праз жыццё Рагнеды беларускі пісьменнік Іван Чыгрынаў, які ў 1989 г. напісаў п'есу "Звон – не малітва". Адзіная пакуль пастаноўка гэтага твора была ажыццяўлена ў 1992 г. Нацыянальным Акадэмічным тэатрам імя Я.Купалы [1]. У гэтым творы Рагнеда паўстае перад намі не спалоханай князёўнай, якую Уладзімір вывозіць з разрабаванага Полацка, а сталым чалавекам са сваім светапоглядам. Адзін з асноўных герояў яго п'есы - сын

***Попко Ольга Николаевна.*** *Ассистент каф. философии и культурологии Брестского государственного технического университета.*
*Беларусь, БГТУ, 224017, г. Брест, ул. Московская, 267.*

Рагнеды Ізяслаў. Аўтар звяртаецца да тэмы паганства і барацьбы супраць яго хрысціянскай рэлігіі. Магчыма, тыя часы нечым нагадваюць сучаснасць – змена духоўных арыенціраў, новыя сацыяльнныя ўмовы.

28 ліпеня 1995 г. на сцэне Нацыянальнага Акадэмічнага тэатра оперы і балета адбылася прэм'ера зорнага спектаклю – балета “Страсці” А.Мдзівані ў пастаноўцы В.Елізар'ева. Другая назва балета – “Рагнеда”. На жаль, гэта пакуль адзіны балет на гістарычную тэматыку, створаны ў Беларусі з 1991 г. [2]. Танец, як від мастацтва заўсёды імкнецца да алегарычнасці, уздзейнічае на эмацыянальную сферу гледача. “Страсці” А.Мдзівані магчыма выключны выпадак для сучаснага мастацтва – рэдкае спалучэнне выдатнай музыкі, шматграннасці сюжэта і таленавітага ўвасаблення вобразаў на сцэне. Балет складаецца з дзвух частак. У першай (“Страсці па Рагнедзе”) ідзе распавяданне пра лёс Рагнеды, яна заканчваецца сімфанічнай панарамай “Разбурэнне Полацка”. Другая частка прысвечана тэме хрышчэння, хрысціянству і змяшчае ў сабе музычную карціну “Фрэскі” (“Галгофа”,”Зняцце з крыжа” і “Страшны суд”) [3]. Трагічныя падзеі к.Х-пач.Х1 стст. дазваляюць пераасэнсаваць саму ідэю хрысціянства. Гэта на толькі адлюстраванне сапраўдных гістарычных падзей эпохі “вялікіх зменаў”, але і паказ лёсаў канкрэтных людзей, якія становяцца ахвярамі часу. І ўсё ж такі балет – гэта не гістарычная хроніка, ён не павінен дакладна перадаваць ход падзей. Гэты спектакль ніяк нельга назваць забаўляльным, глядач не адпачывае на ім, а ўвесь час трымаецца ў вялікай эмацыянальнай напружанасці, настолькі ён філасафічны ў шматзначны. У ім як бы сустракаюцца два моцныя культурныя пласты – паганства і хрысціянства. Безумоўна, пастаноўка балета “Страсці” на беларускай сцэне – значная творчая ўдача ўсіх яго стваральнікаў. У 1996 г. пастаноўшчык гэтага балета харэограф Валянцін Елізар’еў атрымаў міжнародную прэмію “Бенуа дэ ля данс”, якая гаворыць аб сусветным узроўні беларускага балета [4].

Яшчэ адна п'еса, прысвечаная падзеям к. Х- пач.Х1 стст. – “Уладзімір і Рагнеда” А.Дударава. У 1998 г. гэты твор быў пастаўлены на сцэне Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра. Вырашаная ў традыцыйным накірунку, пастаноўка не атрымала высокай ацэнкі, адчуваецца яе статычнасць, блізкасць да інсцэніроўкі [5]. Пад назвай “Палачанка” яна ідзе ў ТЮГе.

Не менш значнымі ў гісторыі Беларусі былі і падзеі Х111ст., калі ідзе працэс утварэння ВКЛ, збіранне земляў вакол Навагрудка. Аб гэтым часе параўнальна мала звестак, але важнасць яго цяжка пераацаніць.Таму не здзіўляе ўвага да гэтага перыяду, але адзіны пакуль прыклад увасаблення вялікіх асобаў Х111 ст. – опера гродзенскага кампазітара А.Бандарэнкі “Князь Навагародскі”, якая была пастаўлена ў 1992 г. на сцэне тэатра оперы і балета. Опера – справа надзвычай складаная. Не толькі ў кантэксце напісання, але і пастаноўкі. “Князь Навагародскі” пастаўлены рэжысёрам С.Штэйнам, а лібрэта напісана В.Іпатавай па п'есе Л.Пракопчыка. На сцэне з'явіліся вобразы Войшалка, Міндоўга, кн. Галіцкага. Удалымі атрымаліся масавыя харавыя сцэны, але вакальныя партыі прапрацаваны недасканала [6].

У час узрастання цікаўнасці да гісторыі Беларусі ў першую чаргу творцы звяртаюцца да постацей асоб мужных, складаных, якія жылі і дзейнічалі ў пераломныя для Беларусі перыяды. У к.Х1V – пач.XV ст. ВКЛ ўжо было дзяржавай, з якой лічыліся, якая мела вагу ў еўрапейскім жыцці. Менавіта таму на польскі прастол быў запрошаны кн.Ягайла – фігура неардынарная, супярэчлівая. Яго барацьба за ўладу ў ВКЛ, забойствы па яго загадзе родзічаў, потым паспяховае супрацоўніцтва са стрыечным братам кн.Вітаўтам – сюжэт, дастойны пяра самога Шэкспіра. Вобразы Ягайлы і Вітаўта зараз досыць папулярныя ў беларускім мастацтве. Не мог абмінуць гэтыя постаці і тэатр. У 1993 г. А Дудараў піша п'есу “Купала”. Падзеі, якія ў ёй адлюстраваны – барацьба за ўладу паміж Ягайлай і Вітаўтам, запрашэнне Ягайлы на польскі прастол [7]. Пастаноўка п'есы “Купала” ажыццяўлялася ўжо тры разы. У 1994 г. Гомельскім абласным драматычным тэатрам, у 1995 г. Брэсцкім абласным тэатрам драмы і музыкі, у 1997 г. Нацыянальным Акадэмічным тэатрам імя Я.Купалы. Купалаўцы трошкі іначай раставілі акцэнты : спектакль атрымаў назву “Князь Вітаўт” і галоўная ўвага была дадзена асобе гэтага князя. У колах спецыялістаў лічыцца, што пастаноўка гэтай п'есы купалаўцамі – самая ўдалая. Фонам для гістарычных падзей – супрацьстаяння стрыечных братоў князёў Вітаўта і Ягайлы сталі паганскія абрады на Купалле. У пастаноўцы Брэсцкага тэатра нават удзельнічалі артысты харэаграфічнага ансамбля "Радасць" [8]. Нягледзячы на тое, што сапраўдныя падзеі трактуюцца Дударавым часам вольна, яскрава відна вострая неабходнасць такога спектаклю, які б узнёсла распавядаў пра слаўную беларускую даўніну, калі роля ВКЛ у жыцці цэнтральнай Еўропы была вельмі значнай – гэта спрыяе ўмацаванню патрыятычных пачуццяў, дае магчымасць ганарыцца родным краем. Дарэчы, лёс спектакля купалаўскага тэатра даволі ўдалы. Адзін з доказаў таму – поспех на Міжнародным тэатральным фестывале “Белая вежа” у 2000 г., калі гэты спектакль заваяваў Гран-пры, ім жа і адкрываўся фестываль – па традыцыі ля муроў Белай вежы [9]. Вобраз Вітаўта, як збіральніка земляў і носьбіта ідэі моцнай незалежнай дзяржавы, вельмі пасуе выхаваўчай мэце гісторыі.

Адна з самых папулярных асобаў беларускай даўніны ў 90я гг. – Францыск Скарына – першадрукар, асветнік, чалавек разнастайных ведаў і талентаў. Кожны вучань зараз ведае аб ім, яму ставяць помнікі, прысвячаюць кнігі. Але зараз існуе толькі адзін узор звароту да постаці Скарыны ў сучаснай драматургіі -- п'еса М.Адамчука і М.Клімковіча “Віта брэвіс, або нагавіцы святога Георгія”. У 1994 г. яна пастаўлена на сцэне Рэспубліканскага тэатра-лабараторыі беларускай драматургіі [10].

Але гісторыя прыцягвае нас да сябе не толькі маштабнымі падзеямі, гераічнымі ўчынкамі, мужнымі перамогамі. Ёсць у беларускай гісторыі постаці і падзеі, якія з цягам часу набылі рамантычны арэол, абраслі легендамі, а часам і проста пераўтварыліся ў прывіды. Адна з самых прыгожых гісторый кахання – гісторыя Барабары Радзівіл і польскага караля Жыгімонта Аўгуста. Падзеі, якія адбыліся ў XV1ст., і зараз хвалююць гледача, які прыходзіць паглядзець сцэнічныае ўвасабленне тых дзён. У 1994 г. Рэспубліканскі тэатр-лабараторыя беларускай драматургіі паставіў п'есу маладой пісьменніцы Раісы Баравіковай “Барбара Радзівіл” [11]. 2001 г. у тэатральным жыцці краіны можна назваць “годам Барбары Радзівіл”. У трох тэатрах Беларусі ідзе п'еса А.Дударава “Чорная панна Нясвіжа”. У снежні 2000г. адбылася прэм'ера гэтай пастаноўкі ў Гродзенскім абласным драматычным тэатры, летам 2001 г. свет пабачылі яшчэ дзве версіі гэтага спектаклю : у Нясвіжскім раённым цэнтры культуры і адпачынку і Нацыянальным Акадэмічным тэатры імя Я.Купалы. Тэатр Я.Купалы – адзін з лепшых па Беларусі. Да таго ж у пастаноўку “Чорнай панны” на гэтай сцэне ўкладзены па нашых мерках вялікія грошы – каля 35 тыс долараў. Таму і дзея атрымалася пышная – з багатымі і разнастайнымі касцюмамі, тэатральнымі спецэфектамі [12]. Гэты спектакль добра глядзіцца, падабаецца дарослым і моладзі, становіча ўспрыймаецца крытыкамі. На восеньскім тэатральным фестывале “Белая вежа 2001” праца купалаўцаў была адзначана прызам “ За лепшы спектакль беларускай драматургіі” [13]. На тым жа фестывале на суд гледача была прадстаўлена яшчэ адна пастаноўка на гістарычную тэму: у брэсцкім абласным тэатры Андрэй Бакіраў паставіў п'есу С.Кавалёва “Саламея”. Галоўная гераіня гэтага твора – знакамітая лекарка Саламея Русецкая, якая пакінула змястоўныя ўспаміны аб сваім

бурлівым жыцці, паводле якіх Кавалёў і напісаў п'есу. Складаны, супярэчлівы гэты вобраз жанчыны апантанай, незалежнай, зацікавіў не аднаго рэжысёра. У гэтым сезоне п'еса ідзе на малой сцэне Нацыянальнага Акадэмічнага тэатра імя Я.Купалы [14], а ў 1997 г. была пастаўлена Мінскім абласным драматычным тэатрам (Маладзечна) [15]. На мой погляд, твор гэты вельмі ўдаўся аўтару, які змог яскрава перадаць багаты ўнутраны свет жанчыны, якая шмат чаго перажыла ў сваім жыцці, пабачыла на ўласныя вочы розныя краіны -- еўрапейскія і азіяцкія.

Сучасны беларускі глядач з цікаўнасцю ставіцца да спектакляў на гістарычную тэму.Творчае пераасэнсаванне падзей сівой даўніны дае штуршок для развіцця нацыянальнага тэатра, нацыянальнай драматургіі. Вядома ж, дзесяцігоддзе – зусім малы перыяд для з'яўлення вялікай колькасці таленавітых п'ес. Талент драматурга – рэдкая з'ява. Канешне, вельмі хочацца, каб драматургі звярталіся да больш шырокага кола тэм, а не тапталіся вакол ужо "распрацаваных" перыядаў і вобразаў. З 1991 па 2001 гг. на сцэнах беларускіх тэатраў было пастаўлена 7 аўтарскіх п'ес, прысвечаных гісторыі Беларусі, дзве інсцэніроўкі, 1 опера і 1 балет. Можна нават вызначыць дакладна, якія вобразы больш за ўсё цікавяць драматургаў і рэжысёраў. У першую чаргу гэта перыяд хрышчэння ўсходнеславянскіх зямель у к.Х ст. і падзеі, звязаныя з жыццём Рагнеды. Яму прысвечаны "Звон – не малітва" І.Чыгрынава, "Уладзімір і Рагнеда" А.Дударава, балет "Страсці" А.Мдзівані. Вобразы знакамітых князёў ВКЛ Ягайла і Вітаўта распрацоўваюцца ў такіх творах, як "Купала" А.Дудурава і інсцэніроўцы паэмы "Песня пра зубра" М.Гусоўскага. Значнай папулярнасцю карыстаецца і Барбара Радзівіл, якая ўвасоблена ў п'есах "Барбара Радзівіл" Р.Баравіковай і "Чорная панна Нясвіжа" А.Дударава. Цэлых тры пастаноўкі перажыла п'еса С. Кавалёва "Саламея". Можна таксама заўважыць, што сярод драматургаў на ніве гістарычнай драмы найбольш плённа працуе А.Дудараў.

Калі зрабіць аналіз гістарычнай праблематыкі ў тэатры не вельмі складана, то разабрацца ў сучасным мастацкім жыцці Беларусі няпроста. Мноства мастакоў, якія працуюць у розных тэхніках, жанрах і вырашаюць па-свойму творчыя задачы. Але і ў жывапісе Беларусі назіраецца цікаўнасць да гістарычнага мінулага, постацей гістарычных асобаў, краявідаў і знакамітых месцаў Беларусі. У гэтым накірунку ўжо шмат гадоў плённа працуюць браты Басалыгі. Уладзімір Басалыга, вядомы беларускі графік, у сваіх творах увасабляе старажытныя архітэктурныя помнікі. На выставе "Беларусь – трэццяму тысячагоддзю" у сакавіку 2001 г. ён экспанаваў дзве свае працы : "Кальвінскі збор у Смаргоні"(1996) і "На краі поля Куліковага"(2001) [16]. Міхаіл Басалыга з сярэдзіны 80-х гг. нястомна малюе партрэты гістарычных дзеячоў, прадстаўнікоў знакамітых беларускіх магнацкіх радоў, большасць якіх цесна звязана з радзімай мастака – Случчынай. Ён зрабіў шмат партрэтаў слуцкіх князёў Алелькавўчаў, пачынаючы ад заснавальніка рода кн. Алелькі [17].

У 1990 г. у мастацкім жыцці краіны з'явілася суполка пад назвай "Пагоня", якая аб'яднала звыш 50 членаў саюза мастакоў БССР. У яе склад увайшлі тады лепшыя мастакі Беларусі. І хаця ў дзейнасці гэтай арганізацыі часам залішне было палітычных акцый, але выставы, якія ладзіла "Пагоня", мелі значны рэзананс у грамадстве. Праблема асэнсавання гістарычнага мўнулага закранула многіх членаў суполкі. Шмат увагі гістарычнай тэматыцы прысвячае ў сваёй творчасці Я.Кулік. Яго цікавяць старажытныя будынкі, вобразы кн.Рагвалода, Тура, Ізяслава і князёўны Рагнеды. Тыя ж вобразы сустракаем мы ў творах А.Марачкіна, ён спрабуе ўявіць сабе твары тых, пра каго гісторыя данесла толькі скупыя радкі : Ефрасіння Полацкая, Кірыл Тураўскі, Вітаўт, Скарына і інш. Вобраз Скарыны, дарэчы, адзін з самых папулярных у 90-я гг. Цікавіцца ім і мастак Г. Скрыпнічэнка, які спрабуе перадаць свой погляд на гэтую асобу ў карціне "Францыск на радзіме" [18]. Гэтая тэндэнцыя – вывучэння, адлюстравання гісторыі Беларусі – адзін з галоўных накірункаў дзейнасці "Пагоні" – яскрава прагледжваецца да канца 90-х гг. Мастакі гэтай суполкі не толькі паказваюць свае творы, але і арганізоўваюць тэматычныя выставы, прысвечаныя знакамітым творцам з Беларусі. У 1998 г. імі была арганізавана выстава, прысвечаная 110цігоддзю нараджэння Я.Драздовіча. Акрамя сапраўдных прац мастака, тут былі і творы, зробленыя падчас пленэру на яго радзіме [19].

Але працы мастакоў "Пагоні" не абмяжоўваюцца толькі жывапісам ці графікай.Тут свае творы прадстаўляюць і скульптары. На выставе ў сакавіку 1997 г. можна было пазнаёміцца з "Пагоняй на Грунвальд" В.Борздага, "Еўфрасінняй" А.Шатэрніка [20]. Хацелася б заўважыць, што павагай у скульптараў карыстаюцца ўсё тыя ж вобразы і імёны знакамітых беларускіх асветнікаў і сярэднявечных князёў. Адна з самых цікавых сучасных керамістаў, Тамара Васюк, працуе над увасабленнямі постацей кн.Рагнеды, Барбары Радзівіл, Вітаўта, Усяслава Чарадзея з шамоту. І хаця гэтыя творы не дасягаюць па вышыні нават метра, аўтарка змагла знайсці свой падыход да такога жорсткага матэрыялу, як шамот. У яе творчай калекцыі ўжо мноства прац, магчыма нават гаварыць пра асабісты творчы почарк ва ўвасабленні вобразаў гісторыі, мяккасць, лірызм яе жаночых вобразаў [21].

1990- я гг. прынеслі шмат зменаў не толькі ў сацыяльным і палітычным жыцці краіны, змяніўся воблік беларускіх гарадоў і нават назвы многіх вуліц. Загучалі голасна імёны і прозвішчы тых людзей, што некалі жылі на Беларусі, шмат зрабілі для яе развіцця, славы. Часам імёны гэтых людзей добра знаёмыя за мяжой, на радзіме былі забытыя, невядомыя большасці беларусаў. Так, павольна, вяртаюцца і яны самі на вуліцы родных гарадоў, помнікамі нагадваюць сваім нашчадкам аб мінулым.

Вымушана прызнаць, што не так ужо многа помнікаў гістарычным асобам з'явілася на Беларусі ў 90-я гг. Летам 1997 г. быў адкрыты помнік Н.Ордзе ў г. Іванава Брэсцкай вобласці. Знакаміты мастак і кампазітар нарадзіўся недалёка ад гэтага горада ў в.Варацэвічы. Цяжка ацаніць уклад гэтага чалавека ў беларускую культуру. І менавіта ў к.ХХ ст. яго справы атрымалі належную ацэнку. Нястомны вандроўнік, Н.Орда зрабіў мноства замалёвак архітэктурных помнікаў Беларусі, многія з якіх не захаваліся, ці захаваліся часткова. Каб не творы Орды, мы нават не змаглі б сабе ўявіць краявіды Беларусі Х1Х ст.працы Н.Орды з'яўляюцца зараз неабходнымі і для рэстаўратараў, даследчыкаў, музейшчыкаў. Малады скульптар Ігар Голубеў стварыў вобраз чалавека апантанага сваёй справай. Колькі раз вось так спыняўся ён дзе-небудзь у парку і натхнённа маляваў куток беларускай даўніны. Зараз спыніўся ён назаўсёды на галоўнай вуліцы Іванава, апрануты па-дарожнаму, трымаючы ў руках мальберт і пэндзаль. На гранітным пастаменце напісана :"Напалеон Орда. Мастак, кампазітар, музыкант" [22].

У к. 1998 г. у Мінску ў двары галоўнага універсітэта краіны былі ўстаноўлены помнікі Ф.Скарыне (скульптар Сяргей Адашкевіч) і М.Гусоўскаму (скульптар Уладзімір Панцялееў). Гэта першыя помнікі знакамітым дзеячам ХV1ст. у Мінску, а помнік Гусоўскаму – адзіны на Беларусі [23]. П'едэстал помніка М.Гусоўскаму ўпрыгожаны выявай сцэны палявання на зубра. Той, які змяшчае статую Скарыны, аздоблены старажытным алфавітам і шрыфтам самаго беларускага першадрукара [24].У снежні 2000г. тут з'явілася выява яшчэ адной беларускай асветніцы – помнік Еўфрасінні Полацкай (скульптар Ігар Голубеў) [25]. Плануецца ўзвесці тут скульптурныя выявы і іншых асветнікаў – В.Цяпінскага, У. Пічэты.

Самае апошняе "вяртанне" знакамітага беларуса на радзіму – стварэнне і адкрыццё помніка Пятру Мсціслаўцу ў

Мсціслаўі ў верасні 2001 г. падчас свята беларускага пісьменства. Бронзавая фігура з'явілася ў цэнтры сквера невялікага беларускага гарадка. Аўтары помніка (скульптары А.Батвінёнак, А.Чыгрын і архітэктар Ю.Казакоў) не маглі карыстацца якой-небудзь выявай знакамітага друкара – іх папросту не існуе, таму стварылі вобраз алегарычны. П.Мсціславец стаіць ва ўвесь рост, абапіраючыся адной рукой на друкарскі станок, а другой трымаючы кнігу [26].

Вобразы беларускай гісторыі ў сучасным мастацтве прыцягваюць асаблівую ўвагу, таму што не толькі выражаюць эстэтычныя мэты,але і становяцца сродкамі патрыятычнага выхавання, у якім у першую чаргу павінна быць зацікаўлена дзяржава. Краіна не можа існаваць без сваёй гісторыі, сваіх герояў мінулага, магчыма нават сваіх ідалаў. Чалавек павінен ведаць, што за ім шчыльнымі радамі стаяць продкі, памяць аб якіх дае веру ў заўтрашні дзень.

## СПІСАК ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Смольскі Р. На скрыжаванні.Мн., 1999, с. 173
2. ЮўчанкаН. А. Музычнае мастацтва// Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. Мн., 2000, с.343
3. Гудзей-Каштальян В.Р. Музычна-драматургічная канцэпцыя балета "Страсці" А.Мдзівані ў святле праблемы посткананічнай эвалюцыі жанру// Весці Акадэміі навук Беларусі, серыя гуманітарных навук, 1997, №1, с.63
4. Мушинская Т. Валентин Елизарьев. Мн., 1997, с.128
5. Грамыка Л. Бабруйск – горад асаблівы// Мастацтва, 1999, №6, с.7
6. Куляшова Г. Гістарычнае мінулае ў сучасным прачытанні// Тэатральная Беларусь, 1993, №6, с.48
7. Смольскі Р. Тэатральнае Мастацтва// Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. Мн., 2000, с.358
8. Смольскі Р. На скрыжаванні. Мн., 1999, с.179
9. Команава Т. Апошні?..У ХХ стагоддзі// Культура, 2000, 16-22 верасня, с.2
10. Смольскі Р. Тэатральнае мастацтва//Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. Мн., 2000, с.357
11. Смольскі Р. На скрыжаванні. Мн.,1999, с.175
12. Штэйман Г. Каханне без страўсаў//Культура, 2001, 18-24 жніўня, с.9
13. Такім чынам...//Культура, 2001, 22-28 верасня, с.1
14. Команава Т. Vivat, "Саламея"!//Культура, 2001, 18-24 жніўня, с.8
15. Смольскі Р. На скрыжаванні. Мн., 1999, с.181
16. Пікулік А. Умець гаварыць са сваім часам // Мастацтва, 2001, №6, с.16
17. Басалыга У. Вытокі творчасці// Беларускі гістарычны часопіс, 1996, №1, с.66
18. Шунейко Я. Под старадавним знаком "Пагоні"//Неман, 1991, №9, с.177
19. Шаранговіч Н. "Пагоня " ў рытме пошуку// Літаратура і мастацтва, 1998, 25 верасня, с.11
20. Жогла Н. Быць грамадзянінам...// Літаратура і мастацтва, 1997, 4 красавіка, с.4
21. Яніцкая М. Паплечнікі ў духоўным сумоўі// Мастацтва, 1999, №6, с.24
22. Габрусь Т. Genius creaturae: дух творчасці. Помнікі скульптуры Ігара Голубева// Роднае слова, 1998, №3, с.147
23. Нечаева Е. Скорина и Гусовский : впервые в Минске// Беларусь, 1999, №4, с.29
24. Скарына і Гусоўскі на п'едэсталах//Літаратура і мастацтва, 2000, 30 чэрвеня, с.15
25. Пазняк К. Помнік святой// Літаратура і мастацтва, 2000, 7 студзеня, с.1
26. Крэпак Б. Пётр Мціславец вяртаецца на радзіму...//Культура, 2001, 18-24 жніўня, с.2

УДК 281.93

***Восович С.М.***

# УЧЕБНЫЕ ЗАВЕДЕНИЯ ПРАВОСЛАВНОГО ДУХОВНОГО ВЕДОМСТВА В БЕЛАРУСИ В КОНЦЕ 30 – 50-Х ГОДАХ XIX В.

При каждом императоре православное духовное образование подвергалось реформированию. Причём на характер реформ православных духовных учебных заведений оказывала большое влияние личность императора. Поэтому при Николае I, стороннике внесения единообразия, военного порядка, дисциплины во все области жизни народа и управления, перед духовными школами ставилась задача: сообщать учащимся только знания, необходимые им впоследствии для исполнения своего служебного долга и формировать в будущих священниках шаблонное единообразное сознание. К концу 30-х годов XIX в., в результате постепенных преобразований учебного процесса в семинариях, число изучаемых предметов увеличилось вдвое. Главной целью изменений было стремление дать перевес духовному образованию перед светским.

1 марта 1839 г. была упразднена Комиссия духовных училищ. После её ликвидации высшее руководство духовным образованием было сосредоточено в Св. Синоде. Надзор за исполнением существующих законов в этой области был возложен на обер-прокурора Св. Синода. Высшим исполнительным органом стало Духовно-учебное управление при Св. Синоде, которое непосредственно заведовало капиталами духовно-учебного ведомства. Хозяйственное управление при Св. Синоде контролировало расход духовно-учебных сумм[1]. В результате административных преобразований фактически установленный надзор обер-прокурора de facto превратился в его безграничное господство над духовной школой, которое продолжалось, с незначительным ослаблением в 1867-1884 гг., вплоть до конца синодального периода.

В 1840 г. Св. Синод предложил осуществить ряд мер по преобразованию учебно-воспитательного процесса в семинариях. Сохраняя научный уровень образования, Св. Синод решил его приблизить к практической жизни, т. е. дать воспитанникам такие знания, которые могли бы с пользой для них самих и для будущих их прихожан использоваться в сельском быту. Для этого предлагалось: 1) из главных предметов семинарского курса приспособить к обязанностям сельского священника пастырское богословие и собеседовательное богословие; 2) из вспомогательных предметов преподавать всем ученикам начала философии (логику и психологию), российскую словесность, гражданскую историю, физику, алгебру, геометрию, латинский и греческий языки; 3) ввести в учебный курс новые предметы: естественные науки, начала медицины и сельского хозяйства.

***Восович Сергей Михайлович.*** *Ассистент каф. философии и культурологии Брестского государственного технического университета.*
*Беларусь, БГТУ, 224017, г. Брест, ул. Московская, 267.*